УДК 378

*С. В. Венідзіктаў*
*начальнік кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

# ПРАВААХОЎНАЯ СІСТЭМА Ў СУЧАСНАЙ КАМУНІКАТЫЎНАЙ ПРАСТОРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*У артыкуле прыводзіцца характарыстыка актыўнасці органаў унутраных спраў (ОУС) Рэспублікі Беларусь у сучаснай камунікатыўнай прасторы. Разглядаюцца прававыя падставы пабудовы сістэмы сувязей з грамадскасцю ў ОУС. Аналізуюцца актуальныя праекты друкаваных, аўдыёвізуальных і інтэрнэт-СМІ, прысвечаныя праваахоўнай тэматыцы, асэнсоўваецца іх уплыў на грамадскія працэсы. Прапануюцца напрамкі аптымізацыі масава-інфармацыйнай дзейнасці ОУС.*

***THE LAW ENFORCEMENT SYSTEM IN THE MODERN COMMUNICATIVE SPHERE OF THE REPUBLIC OF BELARUS***

*The characteristic of activity of law-enforcement bodies in the Republic of Belarus in modern communicative space is provided in this article. Legal grounds of creation of public relations system in the Department of Internal Affairs are considered. Relevant projects of printing, audiovisual and internet mass-media devoted to law-enforcement subject are analyzed, their influence on public processes is comprehended. The directions of optimization of law-enforcement bodies' mass information activities are offered.*

Згодна з артыкулам 5 «Галоснасць у дзейнасці органаў унутраных спраў» Закона Рэспублікі Беларусь «Аб органах унутраных спраў» дзейнасць органаў унутраных спраў (ОУС) з'яўляецца галоснай, адкрытай для грамадзян і сродкаў масавай інфармацыі ў той меры, у якой гэта не супярэчыць патрабаванням заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб абароне дзяржаўных сакрэтаў і іншай ахоўваемай законам тайны [1]. ОУС у парадку і межах, вызначаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, інфармуюць дзяржаўныя органы, грамадскія аб'яднанні, СМІ, грамадзян аб стане грамадскага парадку і мерах па яго забеспячэнні. Таму цалкам заканамерным і апраўданым будзе разгляд ОУС як уплывовага і сацыяльна значнага элементу нацыянальнай камунікатыўнай прасторы, які з'яўляецца складнікам інфармацыйна-прававой сферы.

Дзейнасць ОУС Рэспублікі Беларусь як кампанента камунікатыўнай прасторы абумоўлена сістэмнымі характарыстыкамі апошняй. Інфармацыйнае поле рэспублікі па стане на 1 сакавіка 2018 г. складаюць 751 газета (220 дзяржаўных, 531 недзяржаўная), 866 часопісаў (208 дзяржаўных, 658 недзя-

ржаўных), 31 бюлетэнь, 9 каталогаў, 2 альманахі, 9 інфармацыйных агенцтваў, 279 тэле- і радыёпраграм (193 дзяржаўных, 86 недзяржаўных) [2]. У зоне «Байнэту» на пачатку 2018 г. функцыянавалі 307 сайтаў друкаваных СМІ, 303 рэсурсы інтэрнэт-выданняў, 51 сайт радыё і 33 — тэлебачання; больш за 60 % насельніцтва Беларусі аддаюць перавагу спажыванню грамадска-палітычнай інфармацыі ў Сеціве.

Інфармацыйныя паводзіны грамадзян, разгледжаныя ў дынаміцы, паказваюць на рост уплыву новых медыя. Даныя даследаванняў Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта з 2009 г. сведчаць аб зніжэнні цікавасці аўдыторыі да традыцыйных медыя: для друкаваных СМІ паказчык упаў з 62,9 % да 43,8 %, для радыё — з 42,4 % да 28,2 %, для тэлебачання — з 91 % да 85,6 %. У той жа час Інтэрнэт як крыніца інфармацыі за апошнія гады стаў значна больш запатрабаваным (рост аўдыторнай цікавасці з 24,2 % да 53 %, што пераўзыходзіць паказчыкі друкаваных СМІ) [3]. Паляпшэнне доступу да Інтэрнэту і развіццё тэлекамунікацыйных тэхналогій у Беларусі азначае, што выкарыстанне замежных і альтэрнатыўных крыніц інфармацыі мае тэндэнцыю да пашырэння.

Характэрна, што органы ўнутраных спраў прысутнічаюць ва ўсіх сектарах інфармацыйнай прасторы рэспублікі. У сектары друкаваных СМІ гэта забяспечана наяўнасцю ўласных агульнарэспубліканскіх выданняў (газета «На страже», часопіс «Милиция Беларуси»), а таксама значнай колькасцю публікацый на праваахоўную тэматыку ў грамадска-палітычных выданнях. У сектары аўдыёвізуальных СМІ назіраецца рост колькасці праектаў агульнарэспубліканскіх тэлеканалаў, якія рыхтуюцца да эфіру пры непасрэдным удзеле праваахоўных структур. Нарэшце, у апошнія гады адбываецца пераасэнсаванне ролі інтэрнэт-прасторы ў якасці рэсурсу фарміравання прававой культуры грамадзян, прафілактыкі, папярэджання і раскрыцця злачынстваў, наладжвання эфектыўнай сістэмы зваротнай сувязі з грамадскасцю. Напрыклад, прэс-служба Міністэрства ўнутраных спраў выкарыстоўвае ў камунікацыі са СМІ і грамадскасцю сацыяльныя сеткі Twitter, «Вконтакте», відэахостынг YouTube, дзе размяшчаюцца інтэрв'ю, прэзентацыйныя матэрыялы, навіны і тэрміновыя паведамленні. У цэлым у сістэме грамадскіх сувязей ОУС Рэспублікі Беларусь найбольшае распаўсюджванне атрымалі прэс-канферэнцыі, брыфінгі, прадастаўленне інфармацыі для прэсы ў самым розным выглядзе, навіны, артыкулы, экспертныя меркаванні і інтэрв'ю ў СМІ.

Агульны парадак работы ОУС з масмедыя вызначаецца загадам МУС Рэспублікі Беларусь ад 31.07.2014 г. № 266 «Аб арганізацыі ўзаемадзеяння органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў

Рэспублікі Беларусь са СМІ», а таксама загадам МУС Рэспублікі Беларусь ад 28.04.2014 г. № 144 «Аб зацвярджэнні Палажэння аб пазаштатным карэспандэнцкім пункце органа ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь». У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 06.02.2009 № 65 «Аб удасканаленні працы дзяржаўных органаў, іншых дзяржаўных арганізацый са СМІ» дзяржаўныя органы абавязаны забяспечваць своечасовае і аб’ектыўнае інфармаванне грамадскасці аб падзеях сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця краіны, таксама ўсе органы дзяржаўнага кіравання павінны мець у штаце прэс-сакратара або адказнага за працу са СМІ кіраўніка структурнага падраздзялення (пры гэтым кіраўнік дзяржаўнага органу нясе персанальную адказнасць за стан работы са СМІ).

Упраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязей МУС Рэспублікі Беларусь ажыццяўляе агульнае кіраўніцтва і каардынацыю дзейнасці прэс-службаў тэрытарыяльных органаў. Асноўнымі задачамі дзейнасці ўпраўлення з’яўляюцца: 1) арганізацыя інфармацыйнага забеспячэння дзейнасці МУС і яго структурных падраздзяленняў; 2) пастаяннае ўдасканаленне і ўмацаванне сувязей з грамадскасцю; 3) фарміраванне ў грамадскай свядомасці станоўчага іміджу супрацоўнікаў ОУС і ваеннаслужачых унутраных войскаў. Адным з асноўных напрамкаў дзейнасці прэс-службаў ОУС з’яўляецца фарміраванне інфармацыйных плыняў, якія адлюстроўваюць актуальны стан прававой сферы.

Мы лічым, што інфармацыя аб дзейнасці сістэмы права і праваахоўных органаў з’яўляецца асновай замацавання ў грамадстве прававой культуры і станаўлення грамадзянскай маралі. У гэтай сферы крышталізуецца карціна сацыяльнай канфліктнасці, становяцца відавочнымі фактары сацыяльных адхіленняў. Супярэчнасці прававой сістэмы і актуальных дэвіяцый соцыума, актуалізаваныя ў СМІ, могуць выступаць стымулам для аптымізацыі грамадскіх адносін (змяненне альбо прыняцце законаў, перагляд прынцыпаў права, традыцыйных адносін на міжсуб’ектным узроўні і г. д.) [4].

Медыяпраекты, прысвечаныя барацьбе са злачыннасцю, прафілактыцы правапарушэнняў і злачынстваў, паказу дзейнасці праваахоўных і судовых органаў, у Рэспубліцы Беларусь традыцыйна маюць высокую папулярнасць сярод розных аўдыторных груп. У эфіры цэнтральнага і рэгіянальнага тэлерадыёвяшчання Беларусі прававая сфера прадстаўлена нераўнамерна. Першае ў сілу агульнанацыянальнага ахопу аўдыторыі і больш цеснай сувязі з органамі дзяржаўнага кіравання дэманструе максімальны ахоп усіх з’яў, якія ўваходзяць у катэгорыю прававых. Да прыкладу, агляд найбольш значных падзей у прававой сферы прадстаўлены ў тэлепраграме «Зона Х» на канале «Беларусь 1». Тут жа выходзіць у эфір сумесны праект Агенцтва тэлевізійных навін Белтэлера-

дыёкампаніі і Следчага камітэта «Таямніцы следства». Да 100-годдзя беларускай міліцыі (2017 г.) быў рэалізаваны шэраг праектаў: кінастужка «Сляды на вадзе» вытворчасці «Беларусьфільма», дакументальны цыкл «Гісторыя міліцыі ў асобах» (паказана рэальнае жыццё беларускай міліцыі, прыведзены расповеды пра канкрэтныя лёсы і подзвігі), сумесныя праекты МУС і інфармацыйнага агенцтва БелТА, выданняў «СБ. Беларусь сегодня», «Звязда « і інш.

Рэгіянальныя СМІ Рэспублікі Беларусь пры фарміраванні парадку дня робяць акцэнт пераважна на фактах злачынстваў і правапарушэнняў, якія прадстаўляюць відавочную грамадскую небяспеку, і на асвятленні дзейнасці ОУС. Напрыклад, у Магілёўскай вобласці тэлебачанне рыхтуе праграму «Экстрим-среда», у эфір радыё выходзіць праект «Мир безопасности». Аршанскае ТБ «Скиф» выпускае праграму «Правопорядок». Мясцовыя СМІ Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей таксама надаюць увагу фактам супрацоўніцтва памежных абласцей Расіі і Беларусі ў сферы процідзеяння міжнароднай злачыннасці.

Такім чынам, агульнанацыянальныя і рэгіянальныя медыя Беларусі ўтвараюць ўзаемадапаўняльную сістэму, у якой першыя фарміруюць агульны інфармацыйны фон і «парадак дня», другія прапануюць дэталізаваны вобраз грамадскай сістэмы. Парадак дня, замацаваны ў медыясістэме на нацыянальным узроўні, вызначае значнасць лакальных падзей і задае для іх ацэначную шкалу. Вырашаючы задачы дасягнення належнага ўзроўню інфармаванасці насельніцтва, нацыянальныя СМІ здольны выступаць крыніцай фарміравання грамадскай думкі. СМІ, ажыццяўляючы тыражыраванне грамадскай думкі, якая рэгулюе і прадпісвае пэўны тып паводзінаў, спрыяюць трансляцыі ўзораў грамадзянскага дзеяння ў межах дзяржавы і ў прасторы міждзяржаўнай камунікацыі.

Вывучэнне грамадскай думкі аб рабоце міліцыі Магілёўскай вобласці Беларусі паказала, што СМІ з’яўляюцца для грамадзян другой па значнасці крыніцай інфармацыі аб органах унутраных спраў пасля асабістага вопыту. У дадзеным выпадку дзейнічае ўніверсальны прынцып: калі акцэнт у СМІ робіцца на правапарушэннях і росце іх колькасці, то ў аўдыторыі складваецца ўражанне аб негатоўнасці праваахоўных структур супрацьстаяць крыміналізацыі грамадства (апісваецца фармуліроўкай «Дзе была міліцыя?»); пры факусіраванні ўвагі на паспяховым раскрыцці злачынстваў і пакаранні вінаватых фарміруецца адносна спрыяльны інфармацыйны фон. Ідэалізацыя вобразу супрацоўнікаў міліцыі ў тэлерадыёэфіры, якая супярэчыць устойлівым уяўленням і ўласнаму вопыту аўдыторыі, як правіла, выклікае рэзка негатыўную рэакцыю. Наадварот, паказ руціннай працы па прафілактыцы і раскрыцці правапарушэнняў («без ку-

пюр») спрыяе «ачалавечванню» вобраза праваахоўнай сістэмы і паляпшэнню яе іміджу [4].

Прабелы ў функцыянаванні фармальных каналаў камунікацыі, да якіх адносяцца СМІ, кампенсуюцца развіццём нефармальных каналаў, якія самастойна ажыццяўляюць інтэрпрэтацыю інфармацыі і яе распаўсюджванне ў выглядзе чутак. У сітуацыі, калі звесткі аб падзеях і з'явах у праваахоўнай сістэме валодаюць значнай ступенню сацыяльнай важнасці, недапрацоўкі ў інфармаванні аўдыторыі прыводзяць да фарміравання скажоных уяўленняў грамадзян аб актуальных тэндэнцыях (існуе заканамернасць: любая чутка з'яўляецца недапрацоўкай фармальнай камунікацыі, і зона «гаварэння» чутак роўная зоне «маўчання» апошняй). Дадзеная заканамернасць з'яўляецца, бадай, асноўным фактарам росту папулярнасці ў беларускай інтэрнэт-прасторы відэаблогаў, у якіх размяшчаюцца матэрыялы крытычнай накіраванасці аб рабоце міліцыі (часцей за ўсё аб'ектамі крытыкі становяцца Дзяржаўтаінспекцыя і патрульна-паставая служба). Напрыклад, відэаблог Васіля Целагрэйкіна (Василия Телогрейкина) (ананімнага «лідэра кампаніі грамадзянскага непадпарадкавання інспектарам ДАІ»), набіраючы дзясяткі тысяч праглядаў, першапачаткова быў арыентаваны выключна на «выкрыванне» ДАІ, аднак у апошні час звяртаецца да практыкі і іншых падраздзяленняў. Прывядзем прыклад эфектыўнай дзейнасці ў Інтэрнэце падраздзяленняў органаў унутраных спраў: у 2012–2018 гг. супрацоўнікамі аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязей Галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага гарвыканкама быў рэалізаваны інтэрнэт-праект «Перахоп», які дазваляў карыстальнікам садзейнічаць ахове грамадскага парадку.

Задачай, рашэнне якой не ў поўнай меры знаходзіцца ў сферы кампетэнцыі ОУС, з'яўляецца адэкватная трактоўка інфармацыі журналістамі: у імкненні прытрымлівацца папулярных фарматаў і жанраў, падаваць навіны найбольш аператыўна, павышаць аўдыторныя рэйтынгі СМІ нярэдка прапаноўваюць грамадзянам скажоную інфармацыйную карціну рэчаіснасці. На наш погляд, адным са шляхоў процідзеяння названай тэндэнцыі з'яўляецца павышэнне агульнага ўзроўню медыйнай граматнасці супрацоўнікаў праваахоўных структур, што дасць магчымасць павысіць паказчыкі інфармацыйнай культуры пры зносінах з прадстаўнікамі СМІ. У Магілёўскім інстытуце МУС дадзены накірунак рэалізуецца пры дапамозе ўвядзення ў навучальныя планы вышэйшай адукацыі дысцыпліны «Інтэрнэт-камунікацыя ў дзейнасці органаў унутраных спраў», у навучальныя планы перападрыхтоўкі — дысцыплін «Сувязі з грамадскасцю ў дзейнасці органаў унутраных спраў» і «Карпаратыўная культура і імідж». Напрыклад, ажыццяўленне падрыхтоўкі супрацоўнікаў ОУС ў межах дысцыпліны «Сувязі з грамадскасцю ў дзейнасці органаў унутраных спраў»

прадугледжвае засваенне асноўных прынцыпаў і спосабаў арганізацыі работы з грамадскімі аб'яднаннямі, насельніцтвам і СМІ з мэтай удасканалення форм і метадаў дзейнасці, накіраваных на фарміраванне пазітыўнага грамадскага меркавання аб праваахоўных органах. У межах гэтай і іншых дысцыплін навучэнцы набываюць веды аб прынцыпах і асаблівасцях вывучэння грамадскай думкі, аб ролі грамадскай думкі ў ацэнцы эфектыўнасці дзейнасці органаў унутраных спраў, засвойваюць механізмы ўзаемадзеяння са СМІ і грамадскімі аб'яднаннямі, набываюць уменні планавання і кантролю арганізацыі працы па ўзаемадзеянні з грамадскасцю.

Такім чынам, пашырэнне прысутнасці органаў унутраных спраў у сучаснай камунікацыйнай прасторы Рэспублікі Беларусь выклікана як агульнымі тэндэнцыямі паглыблення розных форм інфармацыйнага абмену ў грамадстве, так і ўсведамленнем задач, якія ставіць перад праваахоўнымі органамі эпоха масавай лічбавізацыі і медыятызацыя. Эфектыўнасць удзелу ОУС у станаўленні новай нацыянальнай мадэлі камунікацыі шмат у чым будзе залежаць ад узроўню прафесійнай кампетэнтнасці структур, якія адказваюць за пабудову сістэмы сувязей з грамадскасцю, а таксама ад масавага распаўсюджвання рэсурсаў фарміравання медыяінфармацыйнай граматнасці.

## Спіс асноўных крыніц


1. Об органах внутренних дел Республики Беларусь [Электронный ресурс] : Закон Респ. Беларусь, 17 июля 2007 г., № 263-З : в ред. от 19.07.2016 г. № 408-З // КонсультантПлюс. Беларусь / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2018. Вернуться к статье

2. Сведения о средствах массовой информации, информационных агентствах на 1 марта 2018 г. [Электронный ресурс] / Официальный сайт Министерства информации Республики Беларусь. – Режим доступа: http://www.mininform.gov.by/ru/statistica-ru/. – Дата доступа: 04.04.2018. Вернуться к статье

3. Белорусская национальная медиасфера. Социологический аспект / под общ. ред. О. В. Пролесковского, А. В. Гусева, Л. Е. Криштаповича. – Минск : Информ.-аналит. центр при Админ. Президента Респ. Беларусь, 2011. – 108 с. Вернуться к статье

4. Венидиктов, С. В. Отражение функционирования правовой сферы в телерадиоэфире Республики Беларусь / С. В. Венидиктов // Известия Уральского федерального университета. Сер. 1. Проблемы образования, науки и культуры. – 2013. – № 3. – С. 17–24. Вернуться к статье